

## СЛАВА ВЯЛІКАМУ КАСТРЫЧНІКУ!

*Работнікі навукі і вышэйшых навучальных устаноў! Змагайцеся за далейшы росквіт навукі, за тэхнічны прагрэс! Рыхтуйце спецыялістаў, вартых эпохі камунізма!*

*Слава перадавой савецкай навуцы!*


Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№№ 35-36 Пятніца, 6 лістапада 1964 г. Цана 2 кап.


Рыгор СЕМАШКЕВІЧ

## На ленінскую станцыю Разліў

Я восенню пайду між спелых ніў
Па сцежках, пуцявінах і дарогах
На ленінскую станцыю Разліў,
І будзь шчаслівая гэта
падарожжа!

Я ведаю, прайшло ўжо многа зім,
Як ён садзіў дубок у гэтым краі.
Я шапку скіну перад дубам тым,
Я жалудоў даспелых назбіраю.

Хай на прасторах роднай старакы
Яны да неба ўзносяцца з вякамі.
Няхай шумяць з вясны і да вясны
Упоруч з белавежскімі дубамі!..

## Упэўненыя крокі новай кафедры

Біяфізіка — навука маладая. Яна займаецца, у асноўным, вывучэннем абмена энергіі ў арганізме. Біяэнергетыка, радыёбіялогія, фізіка-хімічныя метады—вось толькі некаторыя галіны гэтай навукі. З кожным днём жадаючых вывучаць біяфізіку становіцца ўсё больш.

У мінулым навучальным годзе ва універсітэце пачала працаваць кафедра біяфізікі. І ужо ў час стварэння кафедры перад ёй стала задача адабраць з 30 жадаючых студэнтаў сямёрку тых, хто будзе вывучаць біяфізіку. Сёлета гэтыя студэнты вучацца на пятым курсе. Праўда, рыхтаваць дыпломныя работы ім прыходзіцца ў іншых вну, бо лабараторныя ўмовы кафедры пакуль яшчэ даволі абмежаваныя. Сваіх спецыялістаў кафедра таксама пакуль што не мае. Работа яе будуецца па ўзору аналагічных кафедраў Маскоўскага і Ленінградскага універсітэтаў.

Студэнты, якія захапляюцца біяфізікай, наведваюць навуковы гурток, дзе можна атрымаць пэўныя веды ў гэтай галіне.

Зразумела, з цягам часу студэнты універсітэта атрымаюць магчымасць праводзіць складаныя біяфізічныя эксперыменты ва ўласнай лабараторыі. Але і цяпер ужо яны добра падрыхтаваны. Пра гэта гавораць шматлікія станоўчыя водгукі аб практыцы студэнтаў біяфака. І хто ведае, можа сённяшнія студэнты заўтра стануць вядомымі вучонымі. Бясспрэчна адно — іх будучая праца стане добрым укладам у развіццё біяфізічнай навукі.

А. ДЗЕРАШ.

## Ёсць беларуская нафта!

Калісьці пра гэта ніхто нават і не марыў. Нашу рэспубліку лічылі вельмі беднай карыснымі выкапнямі. Каменная і калійная солі, нафта і каштоўныя мінералы ляжалі некранутымі. Беларускія геолагі ўпарта вялі пошукі гэтых скарбаў. Кожны год прыносіў новыя перамогі, адкрыцці. І вось яшчэ адна радасная вестка: ёсць чорнае золата ў роднай Беларусі!

Гэтай падзеі прысвяцілі сваё чарговае пасяджэнне студэнты геаграфічнага гуртка. Яго кіраўнік, кандыдат геолага-мінералагічных навук Дзмітрый Міхайлавіч Карулін падкрэсліў вялікае значэнне адкрыцця месцанараджэння нафты ў Беларусі. Гэта значыць, што на захадзе нашай краіны адкрыта новая нафтаносная вобласць.

Сведкам і ўдзельнікам вялікай перамогі беларускіх геолагаў быў наш таварыш, студэнт 5 курса геафака Валерый Чупрыс, які праходзіў летнюю вытворчую практыку ў складзе Рэчыцкай геалагічнай пашуковай партыі.

— Паміж Рэчыцай і Мазыром на Прыпяцкім грабені (грабен — гэта складаная геалагічная структура — упадзіна) я праходзіў практыку, — расказваў гуртkoўцам В. Чупрыс, — і ўдзельнічаў у бурэнні шчыліны нумар восем, з якой пачала фантаніраваць нафта. Рабіў геаграфічную здымку мясцовасці, працаваў калектарам ля шчыліны. Адбіраў і сартыраваў узоры парод, узнятых з недраў зямлі.

Пошукі нафты і газа вядуцца на тэрыторыі Беларусі каля 15 гадоў. Яшчэ больш як дзесяць гадоў назад была атрымана першая нафта, але шчыліна давала яе вельмі мала, ды і складаная геалагічная структура ўскладняла пошукавыя работы.

І вось сёлета ля Рэчыцы са шчыліны № 8 ударыў магутны фантан. Яго сутачны дэбіт звыш 150 тон. Нафта знойдзена на глыбіні 2000 метраў у міжсалявых адкладаннях дэвонскай сістэмы. Там жа, недалёка ад восьмай шчыліны, буравікоў напаткала яшчэ адна ўдача: са шчыліны № 6 атрымана прамысловая нафта з глыбіні каля 3000 метраў у падсалявых адкладаннях дэвона. Лабараторныя доследы паказалі, што знойдзеная нафта вельмі высокай якасці — яна лёгкая і змяшчае ў сябе мала серы.

Адкрытае месцанараджэнне нафты паклала пачатак стварэнню ў Беларусі ўласнай нафтаздабываючай прамысловасці. У гэтым раёне будзе пабудаваны гігант нафтаперапрацоўчай прамысловасці — Мазырскі нафтакамбінат.

Студэнты геафака вельмі цікавяцца карыснымі выкапнямі рэспублікі. На думку Аляксандра Сямёнавіча Махнача, доктара геолага-мінералагічных навук, які чытае на факультэце курс лекцый па геалогіі СССР, нафту на тэрыторыі Беларусі можна знайсці і ў іншых раёнах Палесся.

Так, беларуская нафта пайшла!

Ігар ЛЯСКОЎСКІ,
спец. кар. «Беларускага універсітэта».

# ГАВОРАЦЬ НАШЫ СЯБРЫ

### НГУЕН ЧОНГ БІНЬ (В'етнам),

студэнт 3-га курса фізфака

Лістапад. Цяпер у нас, у В'етнаме, яшчэ цёпла, грэе сонца і ідзе ўборка ўраджаю рысу, а тут, у Мінску ўжо халады пачаліся. Але там, на Радзіме, і тут, на Беларусі, — святочны настрой. В'етнамскі народ з вялікай радасцю сустракае Вялікі Кастрычнік.

З таго дня, калі грукат грому Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Расіі страсянуў увесь свет, народы калоній, ахвяры сацыяльнай няроўнасці, бачылі ў Савецкім Саюзе свайго вернага сябра, надзею на свабоду і незалежнасць.

Таварыш Нгуен Ай Куок (наш прэзідэнт Хо Шы Мін) у свой час сказаў: «Каб вызваліцца, трэба ісці па шляху рускіх». І наш народ ішоў па гэтым шляху. Цяпер сацыялізм распасцёр свае крылы і над нашай краінай.

У нас часта гавораць: «Дзякуючы клопатам партыі я маю поўную чашку рысу», «Партыя дае нам і свет у доме, і свет у розуме». Усе заваёвы рэвалюцыі наш народ звязвае заўсёды са сваёй роднай партыяй, з імем Леніна, з радзімай Кастрычніка.

Калі камунізм — гэта вясна чалавецтва, то Кастрычніцкая рэвалюцыя — гэта веснавое сонца, якое кінула свае жыватворчыя праменні на ўсю Зямлю.

Вялікае шчасце для нас вучыцца ў Савецкім Саюзе. Тут мы бачым сапраўдную дружбу. Мы радуемся вялікім поспехам, якімі сустракаюць свята працоўныя савецкай краіны. Ад усёй душы жадаем савецкаму народу новых вялікіх поспехаў у справе будаўніцтва камунізма.

### АРТУР ТЭТЭ БАТСА (Гана),

студэнт падрыхтоўчага факультэта

47-я гадавіна Кастрычніцкай рэвалюцыі! Гэта цудоўны дзень! У гэты дзень мы з удзячнасцю ўспамінаем барацьбітоў, якія мужна змагаліся за вызваленне Расіі. Святочна настроеныя, мы знаходзімся сярод людзей, мэта якіх— паспяховае будаўніцтва камунізма.

Сёння мы яшчэ раз пераконваемся ў праваце вучэння Маркса і Леніна аб тым, што сацыялізм з'яўляецца той зброяй, якая змяце эксплуататараў.

Былая адсталая царская Расія цяпер дасягнула вялікіх поспехаў у галіне развіцця культуры і навукі. Усе дасягненні навукі савецкая краіна выкарыстоўвае толькі на карысць міру ва ўсім свеце.

Афрыканскі кантынент ахоплены бурай рэвалюцыйнай барацьбы супраць імперыялізму і каланіялізму. Афрыка сёння поўнасцю упэўнена, што самы правільны шлях яе развіцця — сацыялістычны. І мы верым, што прыйдзе дзень, калі кожны куток Афрыкі стане сацыялістычным.

### АНТОНІО САНЧЭС (Куба),

студэнт падрыхтоўчага факультэта

Заўтра мы будзем святкаваць 47-ю гадавіну перамогі пралетарыяту ў Расіі, перамогі, якая прывяла да стварэння новага грамадства, дзе няма эксплуатацыі чалавека чалавекам, дзе ўсе людзі маюць права на працу, на вучобу, на шчаслівае мірнае жыццё.

Мы будзем святкаваць гадавіну вялікай перамогі гераічнага савецкага народа, якая стала першым звяном у вялізным ланцугу перамог гэтага слаўнага народа.

Для народаў, якія змагаюцца за вызваленне ад каланіялізму і імперыялізму, Савецкі Саюз з'яўляецца маяком, які асвятляе шлях да свабоды і незалежнасці. Гэта свята ўсіх краін, што ідуць па шляху, намечаным мужным савецкім народам.

У гэты дзень мы адзначаем яшчэ адну гадавіну бяссілля імперыялізму, які ніколі не зможа спыніць магутны вызваленчы рух народаў свету. За дзевяноста міль ад самай магутнай імперыялістычнай краіны знаходзіцца наша Куба, першая краіна ў Амерыцы, якая будуе сацыялізм. І нашай волі да перамогі нікому не зламаць.

Мы, кубінскія студэнты, будзем адзначаць гэтае свята разам з савецкімі людзьмі і таму мы вельмі шчаслівыя.

Няхай жыве Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя!

Няхай жыве гераічны савецкі народ!

Няхай жыве вечная дружба ўсіх народаў!

Няхай жыве мір!

### ДЖОШУА Б. АЦІЕНА (Кенія),

студэнт падрыхтоўчага факультэта

Мы, афрыканскія студэнты, горача віншуем савецкіх людзей са святам 47-й гадавіны Вялікага Кастрычніка! Мне вельмі пашанцавала. Летась я быў у Маскве ў час святкавання 46-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Там я ўбачыў многа цікавага. Я пераканаўся, што савецкі народ імкнецца да міру і шчасця на ўсёй зямлі.

У СССР вучацца студэнты з многіх краін свету. Я таксама вучуся ў Савецкім Саюзе, хоць імперыялісты заўсёды гавораць, што вучыцца ў СССР можа прыехаць толькі камуніст. Я — не камуніст, але вучуся ў СССР. І гэта яшчэ раз сведчыць пра ілжывасць буржуазнай прапаганды.

*Працоўныя ўсіх кантынентаў! Аб'ядноўвайцеся ў барацьбе супраць імперыялізму, каланіялізму і неакаланіялізму, за мір, дэмакратыю, нацыянальнае вызваленне, за сацыялізм!*

# Дэвіз—рабіць людзям добрае



Калі ад Мінска на карце краіны правесці лініі да ўсіх гарадоў, дзе жывуць і працуюць вучні і выхаванцы прафесара І. М. Лушчыцкага, то атрымаецца даволі густая сетка. Але асабліва густой яна будзе на тэрыторыі Беларусі. Тут няма ніводнай ВНУ, дзе не выкладалі б людзі, якія прайшлі сур'ёзную школу ў Івана Мікалаевіча. Чацвёра на чале з загадчыкам кафедры філасофіі В. М. Пузікавым працуюць у інстытуце народнай гаспадаркі, двое — у Мінскім педінстытуце, двое — у Магілёўскім машынабудаўнічым. Адзін спіс прозвішчаў складзе некалькі старонак. А ва універсітэце з ліку вучняў і выхаванцаў І. М. Лушчыцкага можна стварыць калектыў вялікай кафедры.

Такімі поспехамі можна ганарыцца. І Іван Мікалаевіч ганарыцца сваімі вучнямі, пастаянна падтрымлівае з імі сувязь. Вопытны педагог, глыбокі даследчык, ён ахвотна перадае веды сваім маладым калегам, раіць і вучыць, як лепш выхоўваць добрых спецыялістаў, вартых народа і яго гераічных спраў.

Многіх здзіўляе прастата і бескарыслівасць старога камуніста, здзіўляе толькі да таго часу, пакуль ведаюць пра яго па чутках. Варта ж сустрэцца з Іванам Мікалаевічам нават па зусім асабістаму пытанню, як пераконваешся, што прастата, сціпласць, бескарыслівасць — не паказное ў яго характары, у яго ўчынках. Рабіць людзям добрае, карыснае— што можа быць даражэй і больш прыемным для чалавека, які бачыць у гэтым сэнс свайго жыцця!

Неяк супрацоўнікі кафедры філасофіі і логікі, якую ўзначальвае Іван Мікалаевіч, зрабілі цікавы падлік. За апошнія дзесяць гадоў прафесар 53 разы выступаў афіцыяльным апанентам пры абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый. Для гэтага неабходна было прааналізаваць 20 тысяч старонак тэксту. Да таго ж, апанент абавязан азнаёміцца з літаратурай па тэме, гутарыць з дысертантамі. Колькі пайшло на гэта часу, сіл!

Але з гэтым не лічыцца Іван Мікалаевіч, хоць у яго можна павучыцца ўменню цаніць час. Важна, не тое, колькі часу патрачана. Галоўнае — ён не павінен губляцца дарэмна. Таму вельмі часта прафесара можна бачыць па дарозе дамоў з універсітэта ў акружэнні тых, хто шукае яго дапамогі, парады. Карысная прагулка — у літаральным сэнсе.

— А інакш і нельга, — жартуе Іван Мікалаевіч, — час дыктуе нам свае законы, прымушае паважаць сябе.

Дарэчы, гэта не жарт, калі ўлічыць тую вялізную работу, якую вядзе прафесар: чытае лекцыі, займаецца навукова-даследчай дзейнасцю, рэцэнзіраваннем і рэдагаваннем прац вучоных, кіруе Мінскай гарадской арганізацыяй таварыства «Веды», загадвае кафедрай, кіруе работай шасці аспірантаў. Іван Мікалаевіч — старшыня аб'яднанага вучонага Савета гуманітарных навук пры універсітэце; чатыры гады ён быў членам экспертнай камісіі ВАК'а, выбіраўся членам гаркома і райкома партыі, дэпутатам гарсавета. І усюды трэба паспець, любую работу неабходна зрабіць добра.

Пяцьдзесят навуковых прац і тэарэтычных артыкулаў выйшла з-пад пяра вучонага. Ён унёс вялікі ўклад у даследаванне не толькі гісторыі айчыннай філасофскай думкі, але і тэорыі і практыкі камуністычнага будаўніцтва. У гэтай сувязі нельга не спаслацца на такія прыклады. 30 гадоў назад Іван Мікалаевіч напісаў першую работу аб савецкай сацыялістычнай дэмакратыі. Цяпер у актыве вучонага цэлая бібліятэка сваіх матэрыялаў па гэтай тэме. Пад кіраўніцтвам І. М. Лушчыцкага на кафедры рыхтуецца вялікая манаграфія «Рух за камуністычную працу і будаўніцтва камунізма». Да гэтай работы прыцягнуты больш як 30 аўтараў з розных ВНУ і навукова-даследчых устаноў. Адначасова Іван Мікалаевіч рыхтуе да друку навучальныя дапаможнікі па асновах навуковага атэізму, па этыцы.

— Работы многа, — гаворыць вучоны. — Але наперадзе яшчэ вялікія планы—і ў навуковых даследаваннях, і ў падрыхтоўцы кадраў вучоных.

У дзень свята пажадаем старому камуністу, прафесару Івану Мікалаевічу Лушчыцкаму новых поспехаў і добрага здароўя.

У. КУЛАЖАНКА,
М. РЭГІСТАНАЎ.

# ЯГО ЖЫЦЦЁ—ПРЫКЛАД ДЛЯ ЎСІХ

Усяго толькі чацвёрты год загадвае кафедрай фізікі цвёрдага цела доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар Мікалай Фёдаравіч Кунін. Вялікі жыццёвы вопыт, уменне бачыць галоўнае ў рознабаковай штодзённай працы, нястомная любоў да яе, сумленнасць і прынцыповасць — характэрныя якасці Мікалая Фёдаравіча.

Вядома, што падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў па фізіцы цвёрдага цела для народнай гаспадаркі нельга весці без добрых кадраў навуковых работнікаў. Выхаванне маладога пакалення вучоных узяў на сябе Мікалай Фёдаравіч. Адзінаццаць аспірантаў і тры супрацоўнікі кафедры пад яго кіраўніцтвам пачалі выкананне навуковых даследаванняў па тэмах кандыдацкіх дысертацый. Вялікую каштоўную дапамогу ў росце навуковых кадраў аказваюць штотыднёвыя семінары, на ста пасяджэннях якіх былі абмеркаваны даклады па тэмах даследаванняў работнікаў кафедры, рэфераты, рэцэнзіі і іншыя паведамленні. Усё гэта садзейнічала паспяховаму выкананню навуковых даследаванняў, пра вынікі якіх паведамлялася на ўсесаюзных навуковых канферэнцыях.



Вялікае лектарскае майстэрства Мікалая Фёдаравіча, яго ўменне прывіць цікавасць да навукі прыцягнула многіх студэнтаў да ўдзелу ў рабоце навуковых семінараў, да выканання самастойных даследаванняў. Да кожнага з іх прафесар праяўляе жывую цікавасць, увагу і чуласць.

Занятасць навучальнай і навуковай работай не перашкаджае яму кіраваць на грамадскіх асновах работай адной з лабараторый фізічнага факультэта. І тут Мікалай Фёдаравіч удзяляе вялікую ўвагу і аказвае дапамогу супрацоўнікам лабараторыі ў паспяховым выкананні плана навуковай работы.

Прафесар М. Ф. Кунін адным з першых адгукнуўся на заклік рэктарата чытаць лекцыі на малодшых курсах вядучымі вучонымі факультэта. Яго лекцыі на другім курсе павысілі цікавасць студэнтаў да заняткаў, да авалодання навукай. Некаторыя студэнты ўжо азнаёміліся з работай кафедры і ўдзельнічаюць у навуковых даследаваннях.

Кафедра і асабіста Мікалай Фёдаравіч удзяляюць вялікую ўвагу супрацоўніцтву з прадпрыемствамі Мінска. Для інжынерна-тэхнічных работнікаў прафесар прачытаў вялікі курс лекцый па фізіцы паўправаднікоў, у неабходных выпадках праводзіў кансультацыі па многіх пытаннях вытворчасці. Пры непасрэдным удзеле і пад кіраўніцтвам М. Ф. Куніна вядуцца навуковыя даследаванні па дагаворах з некаторымі прадпрыемствамі Мінска і іншых гарадоў.

Мікалай Фёдаравіч вядзе таксама актыўную грамадскую работу. Старшыня рэспубліканскага бюро фізічнай секцыі таварыства «Веды», член каардынацыйнага Савета Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР па праблемах фізікі цвёрдага цела, прапагандыст — такі далёка не поўны пералік дзейнасці вучонага.

Высокая ідэйнасць, палітычная свядомасць, беззапаветная адданасць Мікалая Фёдаравіча навуцы, працы вучонага і чуласць да людзей з'яўляюцца цудоўным прыкладам для ўсіх.

У гэтыя ўрачыстыя дні хочацца ад усяго сэрца павіншаваць Мікалая Федаравіча са святам Вялікага Кастрычніка, пажадаць яму многіх гадоў жыцця і вялікіх поспехаў у працы.

Ст. выкладчык С. КІСЛЯКОЎ,
дацэнт М. ХАЛІМАНОВІЧ.

# БУДНІ ПРАФЕСАРА

Пётр Фаміч Ракіцкі з'яўляецца адным з буйнейшых вучоных-біёлагаў нашай краіны. Яго навуковыя працы добра вядомы не толькі ў Савецкім Саюзе, але і далёка за яго межамі.

Галоўная тэма даследаванняў вучонага — генетыка. У гэтай галіне Пётр Фаміч — адзін з вядучых спецыялістаў. Ён мае больш як восемдзесят друкаваных прац, многа рэфератыўных работ.

Вучоны пастаянна сочыць за навінкамі айчыннай і замежнай навукі, рэцэнзіруе замежныя навуковыя работы, якія ён рэгулярна атрымлівае з Масквы. Не выпадкова таму ён карыстаецца такім вялікім аўтарытэтам сярод вучоных.

Свае велізарныя веды Пётр Фаміч імкнецца прывіць студэнтам і супрацоўнікам біялагічнага факультэта. Ён кіруе групай аспірантаў і з'яўляецца адначасова кансультантам для навуковых супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта, а таксама для навуковых работнікаў іншых устаноў. Вельмі патрабавальны Пётр Фаміч да сябе і супрацоўнікаў кафедры. Ён заўсёды цікавіцца вялікімі і малымі справамі кафедры і факультэта. Пятра Фаміча часта можна бачыць у акружэнні студэнтаў, якім ён умела, заўсёды імкнецца перадаць любоў да ведаў, да навукі, пашырыць іх кругагляд.

Прафесара глыбока паважаюць не толькі студэнты, якія спецыялізуюцца па кафедры заалогіі хрыбетных, але і студэнты іншых кафедраў. Не было выпадку, каб ён не ўдзяліў належнай увагі каму-небудзь з тых, хто звярнуўся да яго за дапамогай. Спецкурсы Пятра Фаміча выклікаюць вялікую цікавасць у многіх студэнтаў біяфака.

Навуковая і педагагічная дзейнасць Пятра Фаміча заўсёды спалучаецца з яго актыўным удзелам у грамадскай рабоце. Дзякуючы сваім вялікім ведам у галіне біялогіі, ён часта выступае ад таварыства «Веды» з лекцыямі і дакладамі па многіх складаных біялагічных праблемах.

Напярэдадні свята жадаем Пятру Фамічу вялікіх поспехаў у навуковай і навучальнай працы, моцнага здароўя, многіх гадоў жыцця.

Дацэнты Г. ГЛАДКІ
Ф. ВАРОНІН.





# Умелыя і смелыя

Вельмі часта пасля заняткаў у 124 аўдыторыі галоўнага корпуса можна сустрэць групу студэнтаў. Вось і цяпер у аўдыторыі я сустрэла Віктара Наважылава разам з яго сябрамі. Гаварылі яны пра трэніроўкі па водных лыжах, першым папулярызатарам якіх ва універсітэце з'яўляецца Віктар. Проста здзіўляе, як гэты юнак умее размяркоўваць свой час. Ён вучыцца на 5-м курсе фізфака (і нядрэнна вучыцца), уваходзіць у склад савета СНТ факультэта, ён жа і рэдактар бюлетэня СНТ.

Віктар пачаў займацца воднымі лыжамі летась. Малавата было хлопцаў спачатку: Віктар, яго брат Яўген, Валодзя Лебедзеў (ён у мінулым годзе закончыў фізфак). Новае часам з цяжкасцю заваёўвае прызнанне. І пачыналі яны сапраўды з цяжкасцямі: не было ні водных лыж, ні катэра з магутным маторам. Трэніраваліся. Разявак было многа, але займацца пакуль што ніхто не прыходзіў. Пайшлі ў рэспубліканскі Савет. Там памаглі. Далі аб'яву праз газету «Знамя юности». Тэлестудыя зрабіла фільм аб трэніроўках. Зусім нечакана паехалі хлопцы на спаборніцтвы воднальыжнікаў Грузіі, там занялі трэцяе месца. Усё гэта «пройдзеныя этапы».

Цяпер секцыя атрымала усеагульнае прызнанне. Жадаючых займацца воднальыжным спортам становіцца усё больш. Гэта ж спорт смелых і умелых! Тым больш, што на XIX Алімпійскіх гульнях плануецца выступленне савецкіх воднальыжнікаў. А ў нас жа пакуль і майстроў спорту няма. Трэба ліквідаваць адставанне.

Па-сапраўднаму спадабаўся гэты від спорту многім юнакам і дзяўчатам. У секцыі займаюцца Зіна Круглова з 1-га курса матфака, Іра Гурыновіч з 4-га курса філфака. Жана Клячкоўская з 5-га курса фізфака, Валерый Гракаў — малодшы навуковы супрацоўнік.

С. КУРЫЛЬЧЫК.

* * *

На здымку: група універсітэцкіх воднальыжнікаў.

Фота В. Наважылава

# Літаратурная старонка

Хведар ЧЭРНЯ

* * *

Збудаваў бы я дом
не з цэглы,
не з блокаў.
Збудаваў бы я дом
з зіхатлівага белага шкла.
Каб у ім прасвечваліся аблокі,
Каб ён поўны быў сонечнага святла.
Пабудуецца дом. У пяць
ці ў дзесяць паверхаў.
Адвядзе гарсавет мне
кватэру светлую,
І будзе ў ёй дастаткова
і сонца, і ветру,
І новых усмешак суседзяў ветлівых.
Па начах буду чуць,
як дождж па балконах хвошча,
І аднойчы прысніцца мне сон,
што вайны страшней.
Я забуду што недзе ёсць бомбасховішча,
Што туды можна бегчы мне.
Я не веру ні снам,
а ні тым бабулям,
Што гавораць,
як быццам сны нешта значаць.
А ўсё ж,
калі раптам мой дом разбудзяць
Сірэны
і нічога не перайначыць?
Я павінен не ўпасці.
Я павінен прайсці
Да канца пад жалезнымі ліўнямі.
Каб вярнуцца,
каб сталі дамы расці
З зіхатлівага шкла
пад зялёнымі ліпамі!

Марыя ШАЎЧОНАК

## СТЭП

Ні дрэва нідзе, ні кусціка,
Стэп без канца і краю
І калі ў танцы пусцішся—
Прастору усім хапае.

Сонца палынам прагоркла,
Сеўшы за рудым узгоркам.
Як лодкі ля сіняга берага,
Прыціхлі палаткі белыя.

Гэта яны, палаткі,
Цэгла, вада, спяцоўкі —
Для ўзлёту мары крылатай
Першая наша пляцоўка.

Першы падмурак, сцены,
Шэры надзейны цэмент.
Студэнцкія нашы рукі
Не кнігі, а праца вучыць.

Ні дрэва нідзе, ні кусціка,
Стэп без канца і краю.
Зялёныя, роўныя вуліцы
Сняцца высотнаму крану.

Сяргей ЗАКОННІКАЎ

## Восеньскае

Праходжу асеннім вячыстым
борам,
Дзе вырскаюць сокам рабінаў
гронкі.
Мне кожнае дрэва здаецца
зборнікам,
Шапоткае лісце на ім —
старонкамі.
На лісцях, быццам тайнапіс,
жылкі,
Чытаеш і нават вачам не верыш.
Вецер дзьмухне, і з галін
ажыўшых
Лісты апускаюцца звонкімі
вершамі.
Рукою беражнай іх падбіраю,
Як восені залатой аўтограф.
Лепшыя кнігі вятрыска мне раіць,
Здаволены ён ажыўленым торгам.
Бярозкі, нібыта дзяўчаткі
з вершамі,
Дубы, як масцітыя класікі.
Я рады, сябры, дарам іх, паверце,
Толькі б хапіла кішэняў класці.
Дома прагледжу лясныя зборы,
Многа цікавага тут адкрываю.
І шчырыя словы асенняга бору
На чыстым аркушы зноў
ажываюць.

## Плыты на Дзвіне

*Дзед — спацелы, босы — вёсламі*
*Варочае ў хвалях зоркі тонучыя,*
*Удалячынь пазірае вачыма*
*раскосымі:*
*— Сцеражыся! — нясецца над*
*тонямі.*
*Рэха, сціснутае берагамі, рагоча;*
*Ківаюць галовамі росныя сосны.*
*Дзвіна стамілася, спаць ёй*
*хочацца,*
*Бакены, быццам бы вочы сонныя.*
*Плывуць, плывуць на Дзвіне*
*бурлівай*
*Плыты лабастыя. Хвалі іх гоняць,*
*Расчэсвае дождж вярбовыя*
*грывы,*
*Крамяныя сосны цымбаламі*
*звоняць.*



Галіна ПАНЬКО

## Першы стог

*Зямля, быццам палуба,—з боку*
*на бок*
*І боязна, каб не зваліцца.*
*І складзены мною маленькі*
*стажок*
*Здаецца вяршыняй вялізнай.*
*Апошні ахапак духмяны лаўлю,*
*Махаю хусцінкай агністай.*
*І вось я спускаюся ўжо на зямлю*
*Са стомаю альпініста.*



* * *

**Ці вераць людзі,**
**Ці вераць людзі**
**У свае магчымасці без ілюзій?**
**Што толькі вера —**
**Галоўны стымул,**
**Што толькі веры**
**Усё пад сілу?**

**Зямля — матэрыя,**
**Неба — мара...**
**А дні за днямі праходзяць**
**марна**
**Калі памылка**
**Або няўдача**
**І ты падтрымкі сяброў не**
**бачыш.**

**Хоць ты і правы —**
**У нейкі момант**
**Ужо не верыш сабе самому**
**І за нявер'ем,**
**Як цені, роспач,**
**Сумненняў зорны бяссонны**
**россып.**

**Ці вераць людзі,**
**Ці адчуваюць,**
**Як верай кожнага акрыляюць,**
**Што толькі вера — галоўны**
**стымул,**
**Што толькі веры ўсё пад сілу!..**

Мар'ян ДУКСА

## ГАЛУБЫ НАД ПОМНІКАМ

Раніцай на братнюю магілу,
Да сяброў, што сном спяць
векавечным,
Галубоў нясе з-за небасхілу
Першы непаседлівы праменьчык.

Там, дзе голле клёны апускаюць,
Моўкнуць галубы,
Нібы героі,
Тыя,
Што з далоняў іх пускалі.
Ладзілі зімоўкі пад страхою.

Тыя,
Што на ўзмежку поля
Першымі ўпалі пад дубамі,
Каб сягоння над гранітным
помнікам
Неба шапацела галубамі.

Леанід ДАЙНЕКА

## ОТЦЫ

**Из гремящей суровой дали**
**Приходили домой отцы.**
**Приносили с войны медали,**
**Приносили с войны рубцы.**

**Был рассвет в орудийной дрожи.**
**Был закат в молчаливой золе.**
**Стали взглядом отцы построже,**
**Стали сердцем отцы теплей.**

**Мы огнём свои песни полним.**
**Мы глядим на своих отцов.**
**Нам завещано жизнью помнить**
**Звон медалей и боль рубцов.**

## ХЛЕБ

Хозяйки утром хлеб замесят.
Ударит тесто через край.
И вот румяный, словно месяц,
Плывет из печи каравай.

И как главнейшее светило
Встаёт он посреди стола.
И бродит в нём хмельная сила
Печного доброго тепла.

Он отдыхает. Он доволен.
Он нужен всем, в любом дому.
И руки в трудовых мозолях
Любовно тянутся к нему.

## НАЧЛЕЖНІКІ

Яшчэ плугі па камянёх скакалі,
Раллёю свежай пахла.
Тут як тут
Маленькія начлежнікі чакалі,
Каб рассупоніць за бацькоў
хамут.

Умомант асядлаўшы варанога,
Нясліся кавалерыя ў кусты...
Было шкада, што іхняя дарога
Цягнулася не больш, як
паўвярсты.

Паклаўшы цэлы стог сухога
вецця,
Як цемра падступалася з бакоў,
Ля вогнішча рассаджваліся дзеці
Пагаварыць пра ведзьмаў і
ваўкоў...

Шугай, агонь, струменем
залацістым,
І вы шугайце, іскры-светлячкі!..
Бывалымі паселі трактарыстамі
Ля вогнішча былыя хлапчукі.



Заранка апускаецца на гоні,
Загаманіў узлесак салаўём.
Непадалёк стаяць стальныя коні,
І нехта прапаноўвае:
— Спяём...

Бясёлкай пералівістаю фары
Зайгралі тут — мелодыі у лад.
Узносіліся ластаўкамі мары,
Хваляючы, як шмат гадоў
назад.

**Старонка падрыхтавана да друку членамі літаб'яднання «Узлёт».**

Уладзімір ДЗЮБА

## НЯМІГА

*Стужкай зорнай агні правіслі*
*І, здалося,*
*Плывуць у Свіслач.*
*А царква,*
*Якой даўнасць сніцца,*
*Ці не сыпне званы са званіцаў?*
*Ды аўтобусы ціха, пакрысе*
*Адыходзяць уніз па Нямізе.*
*А Няміга, мая Няміга,*
*Неяк раптам талію выгне.*
*Ну і што,*
*Калі хто прыжмурыцца,*
*Прачытаўшы:*
*— Няміга — вуліца?..*
*Як і Свіслач,*
*Цячэ праз вечнасць.*
*Яна пеніцца ад натоўпу.*
*Яна радасная і не топкая.*
*То зусім не агні правіслі,*
*То Няміга збягае ў Свіслач!..*

Рыгор СЕМАШКЕВІЧ

## БУСЛЫ

**Можа ёсць дзе барана старая**
**Або колы з дзедаўскіх калёсаў?**
**Не кідайце так іх — я вам раю**
**Усцягнуць на дуб або бярозу,**
**Што шуміць у вас ля самых**
**вокан.**
**Дужыя галіны утрымаюць.**
**Там прыгожа, вольна і высока.**
**Там буслы паселяцца — я знаю.**
**А буслы. каб шчасцем дом быў**
**повен,**
**Каб жылося ў згодзе і дастатку.**
**Ну, спярша гаспадарам праз**
**коміні**
**Кожны год укінуць па дзіцятку.**
**Дзецям — добрых казак, як**
**малінаў,**
**Сыпануць вячэрняю мінутай.**
**А старым — салодкія ўспаміны**
**Аб гадах, далёкіх і мінулых.**
**Будуць клекатаць яны шчасліва**
**І купацца ў яркіх промнях сонца.**
**Клікаць вас у даль за нашы нівы**
**У незнаёмыя лугі і сосны.**

## АСЕННІЯ ЯБЛЫКІ

Сад вартую. Палку далі мне.
Дзіўнае, прызнацца, наваселле.
У вялікім цёплым будане
Смачна пахне яблыкамі, сенам,
І ніхто не йдзе ўжо шмат начэй.
Мо чакае хто гадзіны лепшай?
І сабака мой зусім здзічэў—
Як на зоры, на ранеты брэша.
Спяць дарогі, вербы ля ракі.
Я не сплю. І ціхі сум, і змора.
Хай бы ў сад залезлі хлапчукі
Абтраслі і яблыкі, і зоры.
Патапталі свежасць летніх траў,
Страх свой пасылаючы да д'ябла.
Я бы і сабаку патрымаў—
Свету не шкада ім — што там
яблык!..

Міхась ГУБЕРНАТАРАЎ

* * *

Я не ведаю стомы ў грудзях,
Нібы Данка і я азарыў бы
Сваім сэрцам нязведаны шлях
І на Марсе кастры запаліў бы.
Хай на сэрцы багата трывог,
Ды ніколі ў жыцці не спасую.
Шмат прайду я цярністых дарог
І сумленна вясну пранясу я.

## НА ЛІТГУРТКУ

Шумна тут ад напружаных
спрэчак,
Ад гартання лістоў і газет.
Тут здаецца мне крытыка печчу,
Дзе гартуецца кожны паэт.
Аж пацеюць ад доказаў хлопцы,
Паціраюць ілбы ад разваг.
А ў душы пасяляецца клопат
За шурпатасць у кволых радках.





ДЗЯЎЧАТЫ.

Фотаэцюд В. Адзіяна.

# МЯДЗВЕДЗЬ—ПЧАЛЯР

*(Байка)*

Хоць рэдка, ды здараецца і так:
Галоўным пчаляром прызначан быў Мядзведзь.
Устрывожыўся садоўнік-Шпак:
— За што такі давер пчалінаму сатрапу?!
За тое, можа, што сасе зімою лапу?
А мо каму падсунуў мёду гляк?
Ды тут пачуўся звон, мякчэйшы медзі:
— Нядобра шчоўкаеш, суседзе..
(То быў Камар. Любіў ён мак падсеяць
І пры двары Мядзведзя
Ён службу званара спраўляў).
— Хачу трывогу Вашу я развеяць,—
Камар салодка прамаўляў,—
— Няхай во скажуць і Сініцы,
Ну, трэба трошкі падзваніць,
Ну, часам сціпла пакланіцца —
Ад гэтага ж спіна не забаліць..
А там ля Мішкі можна й пажывіцца...
Нашто гнявіць уладара,
Мітынгаваць, мяцежна абурацца.
Прыміце Вы параду званара...
Бо што, калі ён зможа ўтрымацца?!
А так яно і можа стацца.
Тады для вас пачнецца...
Ой, нават на магу сказаць—
Так сэрца б'ецца...
Ну, скажам мякка — чорная пара.
Зірніце, узняў ён вулей аж да неба...
А што там тыя Пчолы —
Нектар сасуць і тым вясёлы
П'янчугі ўсе і лятуны.
Змірыцеся... Лёсу дражніць не трэба,
А не — застацца вам без...
Тут ён адчуў, што надта ўжо зарваўся,
Пацёр чырвоны нос
І на даклад к бярложніку падаўся...
А дні ішлі. Быў выгнан Шпак,
Растоптаны калючы Вожык
І знештаваны не адзін дзівак
З тых, што адважваліся Мішку патрывожыць.
Загублена ўжо не адна Пчала.
З іх кожная (па логіцы Мядзвежай)
Распусніцай і п'яніцам была,
Платы пералятала й межы.
Не ведала, як мёд збіраюць свежы.
А званары (размножыўся іх род)
Гулі, вялі бясконца карагод...
І нават на хаўтурах пілі мёд
За медзвядзёву славу й званне.
Ды вось прыйшоў канец ліхому панаванню.
Рой узбурыўся, загуло у садзе.
І выджгаў так яго, што уладар-Таптыга
Упаўшы з дрэва, паламаўшы косці,
Распух
І змоўк навекі на пагосце.
Хто любіць мёд, а не шануе Пчол,
Як той Таптыга, зваліцца на дол.

Якім МУРАВЕЙ.

*Пятро Сушко*

# Гамонка з рамонкам

### ПАСЛЯ ЗАКАНЧЭННЯ ШКОЛЫ

*Кветка,
кветачка-сястрыца,
паступаць куды вучыцца?
Не дай, божа,
памыліцца;
не дай, божа,
праваліцца!
Мама кажа — ў тэатральны,
тата — у індустрыяльны...
Ну, а мне
дзе б ні займацца,
абы толькі ўладкавацца.*

### ПЕРАД ЭКЗАМЕНАМ

*Іду на цяжкія іспыты.
Рамонак-рамон,
скажы ты:
цацаю
ці бюракратам
будзе экзаменатар?
Калі што будзе не ладзіцца,
з кніжкай ці дасць парадзіцца?
Ці можна будзе шаптацца?
Ці пра многае будзе пытацца?..
Ні пуху яму,
ні пяра!
Ні двойкі мне,
ні кала!*

### ПЕРАД РАЗМЕРКАВАННЕМ НА РАБОТУ

*Хутка нас размяркуюць.
Рамоначак, у якую
пашлюць працаваць мяне
вобласць?
Ці дрэнна будзе,
ці добра?
Вось набяруся я гора дзе,
калі не пакінуць у горадзе
Лепш на востраў
святой Марыі,
чым на перыферыю!*

### ДА ВЯСЕЛЛЯ

*Кахае?
Не кахае?
Па іншых уздыхае?
Чакае кожны дзень?
Насустрач мне ідзе?*

### ПАСЛЯ МЯДОВАГА МЕСЯЦА

*На працы затрымаўся?
Гарэлкі насцябаўся?
Зноў будзе сварка?
Стукне па карку?*

### ПАСЛЯ П'ЯНКІ

*Ці то я?
Ці то — не я?
Галава
бы не свая.
Ці я Брут?
Ці то Аўдзей?
Ці я тут?
Ці я ндзе?*

### ПАРОДЫЯ

## *Слова Сербантовіча ад сябе асабіста і ад імя Васіля Макарэвіча*

*І я калісьці быў працоўным.
На хіб ускідваў я мяшок,
Ды не пусты мяшок, а поўны,
І хоць хістаўся, а ішоў.
Цяпер і то часіна тая,
Калі з сябрамі... ўспамяну,
Мяне, як палуба, хістае...
Панюхаў я і цаліну.
Я паважаць сябе прымушу,
Бо значна вырас, пасталеў;
Прыйду ў рэдакцыю да Сушы
І — бух!.. паэмаў па стале.
Ад самапіскі і ад крыку
Язык і рукі ў мазалях.
Няхай «баяцца нас, вялікіх»—
Мяне і сябра Васіля.*

# Падпісвайцеся на часопіс „Филологические науки"

«Филологические науки» — часопіс серыі «Навуковыя даклады вышэйшай школы». У часопісе друкуюцца артыкулы па важнейшых праблемах літаратуразнаўства і мовазнаўства, па гісторыі літаратурных сувязей і пытаннях выкладання літаратуры ў вышэйшай школе.

Часопіс разлічан на выкладчыкаў, аспірантаў і студэнтаў філалагічных факультэтаў вышэйшых навучальных устаноў. Часопіс выходзіць 4 разы ў год.

Цана нумару — 1 руб.; падпісная цана на год—4 руб., на паўгода — 2 руб.

## Да ведама „узлётаўцаў"

Чарговае, 5-е пасяджэнне літаратурнага аб'яднання «Узлёт» адбудзецца 11-га лістапада а 18 гадзіне ў рэдакцыі газеты «Беларускі універсітэт». Наступныя тры пасяджэнні намечана правесці 25-га лістапада, 9-га і 23-га снежня.







★

Віктара Ледзенева, студэнта аддзялення журналістыкі, захапляе пантаміма. А выкананне ім мімічных сцэнак выклікае захапленне гледачоў. «Як ядуць марожанае», «У трамваі», «У кінатэатры» — вось некаторыя назвы яго сцэнак. Паглядзіце, як рэагуюць на выступленне Віктара маленькія гледачы (здымкі ўверсе).

На здымку злева: выступае танцавальны калектыў універсітэта.

Фота В. Луцэнкі.

★

## Сябры віншуюць

Кожны ведае, што дзень нараджэння — гэта адзін з лепшых дзён у жыцці. Таму першакурснікі аддзялення беларускай мовы і літаратуры вырашылі адзначаць дні нараджэння усім курсам.

30 кастрычніка. Чамусьці раней, чым калісь, студэнты прыйшлі на заняткі. У аўдыторыі весела перагаворваюцца юнакі і дзяўчаты.

На тварах усіх студэнтаў радасныя ўсмешкі. І самая шчаслівая з іх — у Ліды. Сябры ўручылі ёй сціплы падарунак і горача павіншавалі з днём нараджэння.

Галіна ЗІНЧАНКА.

Рэдактар П. СІЛІВАНЧЫК.

Адрас рэдакцыі:
г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 03800. Тыр. 2000. Зак. 3907.